*Ж. Л. ВАСЮКОВІЧ*,
настаўніца сярэдняй школы № 15 г. Пінска

# ЖЫЦЦЁ ДЗЕЛЯ БЕЛАРУСІ

## (урок у IX класе, прысвечаны 135-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа)

**Сёлета адзначаецца 135-годдзе з дня нараджэння вялікіх песняроў беларускай зямлі — Янкі Купалы і Якуба Коласа. Прапануем вашай увазе ўрок-свята «Жыццё дзеля Беларусі», прысвечаны гэтым юбілейным датам.**

**Гэта падагульняльны ўрок па творчасці Янкі Купалы і Якуба Коласа, таму яго мэтазгодна правесці напрыканцы навучальнага года. Дзевяцікласнікам прапануецца паўтарыць вывучанае ў папярэдніх класах, пры неабходнасці рыхтуецца раздатачны матэрыял. Урок-свята насычаны разнастайнымі метадамі і прыёмамі, якія ствараюць урачысты і прыўзняты настрой. Гэта і музычная кампазіцыя, з якой пачынаецца ўрок, і віктарына «Сугучнасць верша і малюнка», прагляд сцэнічнага фрагмента з п’есы «Паўлінка», слуханне запісу чароўнага спеву салаўя, гучанне дзіўных гукаў скрыпкі і інш. Урок суправаджаецца мультымедыйнай прэзентацыяй.**

**Матэрыял урока можна выкарыстаць для падрыхтоўкі пазакласнага мерапрыемства.**

М э т а: далучыць вучняў да літаратурнай спадчыны Янкі Купалы і Якуба Коласа, раскрыць патрыятызм беларускіх песняроў, значнасць іх ідэй і творчых дасягненняў.

З а д а ч ы: узнавіць асноўныя факты з жыццёвай і творчай біяграфіі Янкі Купалы і Якуба Коласа, паказаць шматграннасць іх таленту; выклікаць зацікаўленасць іх творамі; развіваць творчыя здольнасці вучняў; удасканальваць навыкі выразнага чытання мастацкіх тэкстаў і маналагічнага выступлення; абуджаць патрыятычныя пачуцці, павагу да класікаў беларускай літаратуры, любоў да Беларусі і роднага слова.

М і ж п р а д м е т н ы я с у в я з і: музыка, сусветная мастацкая культура, беларуская мова.

А б с т а л я в а н н е: фанаграмы песень «Малітва» ў выкананні У. Мулявіна (муз. І. Лучанка, сл. Янкі Купалы), «Мой родны кут» (муз. І. Лучанка, сл. Якуба Коласа), «Спадчына» (муз. І. Лучанка, сл. Янкі Купалы); партрэты Янкі Купалы і Якуба Коласа; выстава кніг «Нам засталася спадчына»; мультымедыйная прэзентацыя; крыжаванкі.

### Ход урока

Гучыць песня «Мой родны кут» (дэманстрацыя слайдаў з беларускімі краявідамі).

**І. Стварэнне эмацыянальнага настрою.**

Н а с т а ў н і к. Рада вітаць вас. Жадаю атрымаць асалоду і задавальненне ад сённяшняга ўрока, каб добры настрой не пакідаў вас увесь дзень.

**ІІ. Матывацыйны этап.**

Н а с т а ў н і к *(прыём інтрадукцыі)*. Урок хацелася б пачаць з адной нявыдуманай гісторыі.

У беларускага дыпламата на адной сесіі ААН калега з Лацінскай Амерыкі спытаў: «А што гэта за дзяржава такая — Беларусь?»

Наш зямляк здзівіўся, але не пакрыўдзіўся і пачаў распавядаць пра нашы трактары, самазвалы і іншае, але адчуў, што той не задаволены. Лацінаамерыканец пацікавіўся:

— А паэты ў вас ёсць?

— Ёсць. Купала, Колас.

— О, Купала?! Гэта іншая справа. Цяпер я маю ўяўленне пра вашу краіну.

Н а с т а ў н і к *(працягвае)*. У гісторыі кожнага народа ёсць паэтычнае імя, якое з’яўляецца яго неафіцыйным сімвалам, якое першае ўсплывае ў памяці і першым называецца, калі заходзіць гаворка пра гэты народ.

Купала... Колас... Яны дараваны нам Богам, каб пра беларускі народ ведалі ва ўсім свеце. Сёлета мы адзначаем 135-годдзе з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа. Сённяшні наш урок прысвечаны гэтым славутым сынам Беларусі.

135 гадоў назад мая зямля
Не ведала яшчэ імёнаў гэтых,
Не ведала, што будзе мець яна
Двух слаўных песняроў — жыцця паэтаў.




**III. Паведамленне мэты ўрока і пастаноўка праблемнага пытання.**

Настаўнік. На сённяшнім уроку мы паспрабуем разабрацца, чаму ж гэтыя імёны славутыя, чаму пра іх ведаюць не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Мне хацелася б, каб вы сэрцам дакрануліся да спадчыны, што пакінулі нам Янка Купала і Якуб Колас.

**IV. Інфармацыйна-пазнавальны этап.**

**А) Жыццё і творчасць Янкі Купалы.**

**1.** Музычная кампазіцыя.

Гучыць песня «Купалінка». У гэты час дзяўчаты, апранутыя ў белыя сукенкі, з вяночкамі на галовах, водзяць купальскія карагоды. Хлопчык шукае папараць-кветку. Аповед пра жыццё Янкі Купалы суправаджаецца паказам слайдаў купалаўскіх мясцін.



Першы вучань. Паводле старажытнага славянскага падання, кожны год у купальскую ноч у лясным гушчары расцвітае чароўная папараць-кветка. Людзі шукалі гэтую дзівосную краску, каб знайсці сваё шчасце. Менавіта з гэтай цудоўнай легендай і звязана літаратурнае імя Янкі Купалы, абранае Іванам Дамінікавічам Луцэвічам, які нарадзіўся на хутары Вязынка 7 ліпеня 1882 года ў сям'і арандатара.

Другі вучань *(чытае ўрывак з верша К. Буйло «У Вязынцы»).*

У хатцы маленькай радзіўся паэт,
Дзе чадна дыміла лучына.
Раз першы адгэтуль ён глянуў на свет
Праз вокны вось гэтай хаціны.

Трэці вучань. Маці — Бянігна Іванаўна Луцэвіч. Бацька — Дамінік Ануфрыевіч Луцэвіч. Усё дзяцінства прайшло на калёсах: ці пераязджалі, ці збіраліся пераязджаць. Няпростым быў шлях да ведаў: не было магчымасці атрымаць сістэмную адукацыю, аднак у душы жыла вялікая прага да ведаў. Усёй душой цягнуўся да кнігі. Днём працаваў на гаспадарцы, а ноччу чытаў усё, што траплялася пад руку. Універсітэтам Янку Купалу было само жыццё.



Бянігна Іванаўна і Дамінік Ануфрыевіч Луцэвічы, бацькі Янкі Купалы.

Чацвёрты вучань *(чытае ўрывак з верша «Мая навука»).*

Мне мудрасці кніжнай не даў Бог пазнаці,
Мой бацька не мог даць раскошаў такіх —
Навучыўся я слоў беларускіх ад маці
І дум беларускіх без школы і кніг.

Настаўнік. Першыя вершы напісаў папольску. Першы друкаваны верш на беларускай мове «Мужык» пабачыў свет у газеце «Северо-Западный край» у 1905 годзе.




Янку Купалу нарадзіла зямля Беларусі, каб паэт убачыў гора і нядолю роднага народа, каб панёс яго крыўду «на свет цэлы» і адстойваў права «людзьмі звацца».

Вучань у нацыянальным касцюме чытае верш Янкі Купалы «А хто там ідзе?».

**Н а с т а ў н і к.** Гэты верш — неафіцыйны «гімн беларускага народа», «сапраўдная жамчужына сусветнай паэзіі», ён перакладзены на 82 мовы свету. Паэтычная спадчына Янкі Купалы — вялікі духоўны здабытак беларускай нацыі. Слова песняра акрыліла беларусаў, зацепліла веру ў лепшую будучыню.

Настаўнік звяртае ўвагу на выставу «Нам засталася спадчына» (называюцца зборнікі Янкі Купалы).




2. Актуалізацыя ведаў (аналіз твораў).

• Якія творы Янкі Купалы вы памятаеце з папярэдніх класаў? *(Вучні называюць паэмы «Курган», «Магіла льва», «Бандароўна», камедыю «Паўлінка» і інш.)*

• Давайце ўспомнім гэтыя творы. Прапаную вам віктарыну «Сугучнасць верша і малюнка». На дошцы размешчаны малюнкі да вядомых твораў Янкі Купалы, а на сталах — лісткі з вершаванымі цытатамі. Неабходна назваць твор і суаднесці малюнкі з паэтычнымі радкамі.

• Чаму мы, людзі XXI стагоддзя, можам павучыцца ў герояў Янкі Купалы? *(Маральнай чысціні, высокай чалавечай годнасці, непадкупнасці, высакароднасці, мужнасці і нескаронасці духу.)*

• Гусляр — улюбёны герой Купалы. Як паэт ставіцца да яго? *(Захапляецца талентам гусляра, які здольны рабіць шчаслівымі тых, хто разумее яго мастацтва, бо для «ўсіх папарацькветка ўзыходзіць», а гэтая кветка — сімвал шчасця. Так і Купала шукаў шчасця для беларускага народа.)*

• Якімі словамі ці характарыстыкамі мы можам аб'яднаць Гусляра і Купалу? *(Песняры, мужныя людзі... Настаўнік удакладняе: «Гусляр — гэта волат духу, такім стаў і сам Купала. Паэта называюць песняром, прарокам, будзіцелем беларускага народа.)*

• Паглядзіце на фотаздымак прыгожай жанчыны, якая ўвайшла ў гісторыю беларускага тэатра як першая выканаўца ролі галоўнай гераіні, што з'яўляецца ўвасабленнем новага жыцця і маладой Беларусі, у аднайменнай п'есе Янкі Купалы. Хто гэта? *(Паўліна Мядзёлка.)* Як называецца п'еса? *(«Паўлінка».)*



**Н а с т а ў н і к.** Камедыя «Паўлінка» прынесла шырокую славу Купалу-драматургу. Была пастаўлена ўпершыню ў 1913 г. у Вільні. З таго часу і да сённяшніх дзён «Паўлінка» не сыходзіць са сцэны Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы і з'яўляецца яго візітнай карткай. Прапаную вашай увазе ўрывак з гэтага спектакля.

**В у ч а н ь** *(чытае верш).*

Гудуць музыкі — музыка іграе,
Паўлінка ўсіх на скокі запрашае.
Пяе прыпеўкі, весела танцуе,
Адольф Быкоўскі побач з ёй гарцуе,
Спяшай, Адольф, пакуль няма Якіма,
З якім яна свой родны дом пакіне.

• Які бытавы сюжэт пакладзены ў аснову камедыі? *(У аснове камедыі — канфлікт новага і старога пакаленняў засцянковай шляхты.)*

• Што сімвалізуе сабой вобраз Паўлінкі? *(Новае жыццё, маладую Беларусь.)*

• Што асуджае і адмаўляе Купала ў гэтай п'есе? *(Патрыярхальны ўклад жыцця, састарэлыя погляды на рэчаіснасць, высмейвае фанабэрыстасць тутэйшай шляхты, якая цураецца беларускай мовы і народнай культуры.)*

**Н а с т а ў н і к.** У 1925 годзе ў сувязі з 20-годдзем літаратурнай дзейнасці Янку Купалу было нададзена званне народнага паэта Беларусі — першаму ў гісторыі беларускай літаратуры.

Але абставіны, на жаль, склаліся так, што ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны, 28 чэрвеня 1942 года, яшчэ не дасягнуўшы 60-гадовага ўзросту, Купала трагічна загінуў у Маскве. Гэта была заўчасная і загадкавая смерць.

Яго няма… А песні следам
Штогод усё мацней звіняць,
І сам ён — звонкая легенда,
Якой і рэху не абняць.

*Валянцін Таўлай. «Памяці Янкі Купалы».*

Гучыць песня «Спадчына».

Н а с т а ў н і к *(працягвае)*. Але Купалава песня і яго імя жывуць у народзе. Імем Купалы названы вуліцы ў розных гарадах, Дзяржаўны літаратурны музей у Мінску, бібліятэка ў Мінску, тэатр у нашай сталіцы і інш.

**3.** Арфаграфічная хвілінка.

На слайдзе напісаны словы:

Купалле, Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы, Дзяржаўны літаратурны музей імя Янкі Купалы, Купалаўскі мемарыяльны запаведнік.

Настаўнік звяртае ўвагу на правапіс гэтых слоў і назваў.

**4.** Хвілінка адпачынку.

Настаўнік прапануе вучням паслухаць «музыку прыроды», спеў ляснога жаваранка, а затым чытае тэкст.

Ніякая іншая птушка, нават праслаўлены салавей, не можа параўнацца ў спевах з лясным жаваранкам. Мелодыя спеваў надзвычай багатая, дзівосна прыгожая і такая выразная, што яе можна палажыць на ноты, а мастак-музыка, напэўна, змог бы выканаць на скрыпцы, але афарбоўкі яе тонаў не патрапіць перадаць ніякі музычны інструмент.

- Ці памятаеце, з якога твора гэты ўрывак? *(«Песня ляснога жаваранка» — урывак з трылогіі «На ростанях» Якуба Коласа.)*
- Якія пачуцці выклікала ў вас гэтая мелодыя? *(Асалоду, захапленне, замілаванне…)*

Н а с т а ў н і к. Якуб Колас чула адгукаўся на хараство і з'явы прыроды, ён захапляўся спевам жаваранка, мог нават адрозніць спевы жаваранка сваёй мясцовасці ад песень іншых жаваранкаў.

**Б) Жыццё і творчасць Якуба Коласа.**

Н а с т а ў н і к. Запрашаю вас прайсціся коласаўскімі сцяжынкамі, якія сталі крыніцай натхнення і вытокам творчасці песняра *(дэманструецца «Карта родных мясцін Якуба Коласа», вучань чытае вершаваны ўрывак «О, край родны, край прыгожы!..» ).*

Якуб Колас… Калі гучыць гэта імя, перад вачыма паўстаюць адкрытыя сонцу жытнёвыя палеткі, шырокія пышныя лугі над Нёманам, векавыя лясы і пушчы. І ўсё гэта Беларусь, якую так цудоўна апеў у сваіх творах пісьменнік.



Карціна Л. Рана.

Ганна Юр'еўна і Міхаіл Казіміравіч Міцкевічы, бацькі Якуба Коласа.

П е р ш ы  в у ч а н ь *(апавядае пра дзяцінства Якуба Коласа)*. Акінчыцы. Тут, у былым засценку, у сям'і Міхала Міцкевіча і Ганны Лёсік 3 лістапада 1882 года нарадзіўся сын Костусь, будучы вялікі паэт. Адсюль, з акінчыцкай хаты, і пачыналіся шляхі-дарогі. Сям'я была вялікая: пяцёра сыноў і чатыры дачкі. Бацька паэта служыў леснікам, яго пераводзілі з аднаго месца на другое, таму дзяцінства прайшло ў маляўнічых кутках Наднямоння на ўлонні прыроды: Ласток, Альбуць, Смольня, вёска Мікалаеўшчына. Але найбольш глыбокае ўражанне пакінула ў паэта мястэчка Альбуць. Менавіта тут адбыўся яго літаратурны дэбют, калі ён, прачытаўшы бацьку свой верш «Вясна», атрымаў першы «ганарар» — сярэбраны рубель *(вучні паказваюць інсцэніроўку)*.

Д р у г і  в у ч а н ь *(працягвае аповед пра Якуба Коласа)*. Першы друкаваны верш на беларускай мове «Наш родны край» пабачыў свет у 1906 годзе ў газеце «Наша доля». Бацька ўсімі сіламі імкнуўся «пусціць сына ў навуку». Якуб Колас паступіў у Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю, скончыўшы якую, паехаў працаваць на Палессе. Спачатку настаўнічаў у вёсцы Люсіна, затым — у Пінкавічах. А з 1912 па 1915-ы працаваў настаўнікам у 3-й прыходскай школе ў Пінску. Тут лёс падараваў Канстанціну Міцкевічу сустрэчу з прыгажуняй, якая на ўсё жыццё стала яго каханнем, натхненнем і шчасцем. Гэта настаўніца Марыя Дзмітрыеўна Каменская. Разам выгадавалі

трох сыноў (у Пінску нарадзіўся Даніла). Час маладосці прынёс багаты творчы плён. Пясняр пакінуў нам разнастайную літаратурную спадчыну. Ён напісаў выдатныя лірычныя вершы. Дзве паэмы Коласа «Новая зямля» і «Сымон-музыка» складаюць залаты фонд не толькі беларускай літаратуры, але і сусветнай культуры.



Якуб Колас з жонкай і сынамі Юркам, Міхасём і Данілам. 1928 г.

• Пазнайце героя аднаго з твораў:

У яго быў свет цікавы:
Свае вобразы, жыццё;
І ў душы яго ўсе з'явы
Сваё мелі адбіццё...

*(Сымонка, урывак «У яго быў свет цікавы...» з паэмы «Сымон-музыка»).*

• А чаму ў яго быў свет цікавы? *(Сымонка непадобны да іншых; ён мог заўважаць, бачыць, чуць, адчуваць так, як не здольны на гэта іншыя людзі, не адораныя талентам.)*

• Што вы можаце сказаць пра коласаўскага героя? *(Якуб Колас апавядае пра хлопчыка, якога Бог і прырода адарылі незвычайным талентам. Але бывае так, на жаль, што таленавітыя людзі адчуваюць сябе няшчаснымі.)*

• Паглядзіце на два малюнкі (адзін — чорна-шэры, другі — рознакаляровы, жоўта-зялёна-блакітны). Ці можна жыццё Сымонкі падзяліць на дзве паловы, на два розныя светы? Аргументуйце свае адказы. *(Чорна-шэры — бацькі і дзеці не разумелі Сымонку, высмейвалі яго, пагарджалі ім, зневажалі, скублі з усіх бакоў, ён быў самотны і адзінокі; рознакаляровы — адзіным сябрам была прырода, хлопчык не проста чуў гукі прыроды, а лавіў гэтыя гукі сэрцам, чуў гармонію і суладдзе.)*

Настаўнік *(падмацоўвае адказы вучняў цытатай з тэксту)*:

І здавалася яму,
Што ён знае, як травінка
Сваю думае думу,
Што гаворыць жытні колас,
І аб чым шуміць ячмень,
І чаго спявае ўголас
Мушка, конік, авадзень...

Значнае месца ў жыцці Сымонкі, апрача прыроды, займала музыка. Ён вельмі любіў іграць на скрыпцы, якую хлопчыку падарыў дзед Курыла. Музыка лілася з яго душы. Паслухаем гучанне скрыпкі. *(Дзяўчынка грае на скрыпцы.)*

• Якія пачуцці або думкі ўзніклі ў вас у час слухання? *(Адказы вучняў.)*

Настаўнік *(падагульняе адказы вучняў)*. Так, талент — самы вялікі дар, але бывае, што мы бяздумна, абыякава ставімся да свайго ці чужога таленту. Музыка абуджае лепшыя пачуцці, выклікае ў нашай душы пачуццё прыгожага. Росквіт шматлікіх талентаў — самае вялікае багацце Беларусі.

• Які важны жыццёвы ўрок даў Якуб Колас, распавёўшы пра жыццё Сымонкі? *(Неабходна бачыць у кожным чалавеку асобу, бо ўсе мы розныя і гэтым цікавыя, з павагай адносіцца да людзей, адораных талентам...)*

• Якія асноўныя тэмы можна вылучыць у творчасці Якуба Коласа? *(Шматлікія творы Якуба Коласа прысвечаны Радзіме, роднай зямлі...)*

• У чым значнасць і каштоўнасць для нас, беларусаў, паэмы «Новая зямля»? *(Гэта беларусазнаўчая кніга, энцыклапедыя народнага жыцця. Слушна гаворыцца: «Калі і наканавана нам знікнуць у свеце, то новыя цывілізацыі мелі б поўнае ўяўленне пра нас, беларусаў, як нацыю, пра нашу зямлю, наш побыт, культуру і звычаі, пра наш характар і ментальнасць, пра нашы каштоўнасці, пра нашы мары і памкненні толькі па адной кнізе — паэме "Новая зямля"».)*




• З якімі ўрыўкамі з «Новай зямлі» мы ўжо пазнаёміліся? *(«Дарэктар», «На рэчцы», «Дзядзька-кухар».)*

• Паспрабуйце пазнаць героя аднаго з раздзелаў:

Ён быў настаўнікам, суддзёю,
Калі, бывала, між сабою
Паспораць дзеткі ці паб'юцца,
Дык да каго тады звярнуцца?
*(Да дзядзькі Антося.)*

• Што вы можаце сказаць пра гэтага коласаўскага героя? *(Яму прысвечаны самыя светлыя, радасныя старонкі паэмы. Праз гэты вобраз славіцца працавітасць, духоўная прыгажосць і веліч народа, яго таленавітасць.)*

• Чаму дзеці найбольш любілі дзядзьку Антося? Кім ён для іх быў? Назавіце адным словам, «хто ён». *(На дошцы прымацаваны лісткі са словамі. Прапануецца выбраць тыя словы-характарыстыкі, якія адносяцца да гэтага героя, аргументаваць свой выбар.)*

1) Апавядальнік;
2) выхавальнік, педагог;
3) псіхолаг;
4) дарадца;
5) майстар на ўсе рукі;
6) суддзя;
7) кухар-«вынаходнік»;
8) жартаўнік;
9) патрыёт;
10) працаўнік.

Адказы вучняў.

Настаўнік. Сапраўды, дзядзька Антось — шматгранная асоба, апякун і выхавальнік дзяцей, іх шчыры сябра і дарадца. Ён любіў зямлю, як і ўся сям'я Міхала, як усе беларусы, любіў працаваць. Галоўная тэма твора фігуруе ў яе назве — «Новая зямля». Зямля — самы дарагі скарб, бяздоннае багацце, карміцелька, святыня, даная Богам:

Зямля не зменіць і не здрадзіць,
Зямля паможа і дарадзіць,
Зямля дасць волі, дасць і сілы,
Зямля паслужыць да магілы,
Зямля дзяцей тваіх не кіне,
Зямля — аснова ўсёй айчыне.

Паэма актуальная, таму што ў наш час узлёту навукі, інавацый у біялогіі, суперпрарыўных генетычных тэхналогій праблема зямлі выходзіць на першы план: людзі не жадаюць спажываць прадукты геннай інжынерыі, а хочуць натуральнай, экалагічна бяспечнай ежы. А гэта значыць, яны вяртаюцца да спрадвечных традыцый, зямля застаецца для іх карміцелькай. Яна — крыніца жыцця і дабрабыту. А як яшчэ героі Коласа звязаны з зямлёй? *(Зямля — родны кут, прыгожая прырода, райская мясціна на свеце, створаная для шчасця людзей.)*

• Чаму беларусам трэба чытаць «Новую зямлю»? *(Гэты твор — найцікавейшая кніга прыроды і жыцця, яна ўтрымлівае багаты пазнавальны змест. Калі жадаеш адчуць усю прыгажосць і вобразнасць беларускай мовы — чытай «Новую зямлю». Лозунгам яе вывучэння павінна быць: «Наша будучае — у нашым мінулым».)*

Настаўнік. Якуб Колас — народны паэт Беларусі. Гэтае званне яму нададзена ў 1926 г. Да апошніх дзён Якуб Колас нёс адказную і пачэсную службу на карысць грамадства. Да апошніх дзён ён хваляваўся пра будучыню Беларусі, стан і лёс беларускай мовы. 13 жніўня 1956 года слаўнага сына нашай Бацькаўшчыны не стала.

Песня Коласа заўсёды,
Як імя яго ў народзе,
Нам навечна застанецца,
Як цяпло любові ў сэрцы.

Імя паэта жыве ў сэрцах людзей, у назвах вуліц, школ, яго імем названы Нацыянальны акадэмічны тэатр у Віцебску, плошча, музей, бібліятэка ў Мінску і інш. Літаратурная спадчына песняра выдадзена ў дваццаці тамах, яна вывучаецца і даследуецца.

**V. Кантрольна-ацэначны этап.**

**1.** Творчае заданне.

• Існуе думка, што Янка Купала і Якуб Колас — браты-блізняты. Прапануецца заданне «Знайдзі 5 адрозненняў (I варыянт) і 5 падабенстваў (II варыянт) у жыцці і творчасці гэтых паэтаў».

**Прыкладны адказ.** *Падабенствы:* абодва народныя паэты, нарадзіліся ў адзін год, друкаваліся на старонках «Нашай нівы», абодва звярталіся да фальклору, стварылі цудоўныя малюнкі прыроды і інш. *Адрозненні:* Купала пачынаў пісаць па-польску, а Колас — па-руску, Купала пачаў друкавацца ў 1905 г., а Колас — у 1906 г., Купала — рамантык, Колас — пераважна рэаліст і інш.

**2.** Вырашэнне праблемнага пытання.

Настаўнік. Спадзяюся, вы ўжо зможаце адказаць на пастаўленае ў пачатку ўрока пытанне «Чаму імёны Янкі Купалы і Якуба Коласа ведаюць у Беларусі і за яе межамі?». *(Вучні адзначаюць, што Купала і Колас — знакавыя імёны, сімвалы Беларусі, яны патрыёты, геніі, самаахвярныя беларусы, зоркі першай велічыні, і зачытваюць выказванні пра паэтаў, размешчаныя на дошцы.)*

А цяпер прапаную разгадаць крыжаванкі *(на кожным стале ляжыць аркушы паперы з падказкай)*.

На дошцы намаляваны крыжаванкі, але закрыты фотаздымкамі Купалы і Коласа, а калі вучні разгадваюць іх, настаўнік адкрывае.




1. З якога твора радкі: «Паміж пустак, балот беларускай зямлі...»?

2. «Ніхто з дамашніх не згадае, чым рэчка ... займае».

3. Горад, у якім Колас пазнаёміўся са сваёй жонкай.

4. Зборнік Купалы 1922 года.

5. Музычны інструмент, які падараваў Сымону дзед Курыла.

**Адказы:** 1. «Курган». 2. Костуся. 3. Пінск. 4. «Спадчына». 5. Скрыпка.




1. Сын Коласа, які нарадзіўся ў Пінску.

2. Імя Янкі Купалы.

3. Жанр п'есы «Паўлінка».

4. Фальварак, у якім нарадзіўся Купала.

5. Першая кніга паэзіі Купалы.

6. Зборнік Купалы 1910 года.

**Адказы:** 1. Даніла. 2. Іван. 3. Камедыя. 4. Вязынка. 5. «Жалейка». 6. «Гусляр».




1. Леснічоўка, дзе прайшло маленства Коласа.

2. Першы надрукаваны верш Купалы.

3. Гераіня паэмы Купалы, якая вызначалася гордасцю і незалежнасцю.

4. «Ганарар» за першы верш.

5. Засценак, дзе нарадзіўся Колас.

6. Галоўны герой паэмы Коласа, які іграе на скрыпцы.

7. Назва адной з казак Якуба Коласа.

8. Пасада бацькі Коласа.

**Адказы:** 1. Альбуць. 2. «Мужык». 3. Бандароўна. 4. Рубель. 5. Акінчыцы. 6. Сымон. 7. Камень. 8. Лясніцтва.

---

**Дамашняе заданне:** падрыхтаваць вуснае выказванне «Купала і Колас — гонар, надзея, будучыня».

Н а с т а ў н і к. Заканчваецца наша сустрэча з песнярамі, але, спадзяюся, што ў вашых сэрцах і памяці яшчэ доўга будуць гучаць музыкай словы Янкі Купалы і Якуба Коласа, паўставаць у памяці нечаканыя і яскравыя вобразы іх паэзіі. Яны былі і застаюцца валадарамі роднага слова.

Імкліва бягуць гады... Але колькі часу ні прайшло б, заўсёды будуць жыць у памяці людской Купала і Колас, без якіх немагчыма ўявіць нашу нацыянальную літаратуру, Беларусь.

На дне гісторыі сівой
Багата чый астыне голас.
Ды зорны крыж
Свячэннем век паверне твой.
*Мікола Мятліцкі.*




Сёняшні ўрок — даніна павагі вялікім паэтам і сынам Беларусі.

Напрыканцы прапаную паслухаць духаўздымную песню «Малітва» («Я буду маліцца і сэрцам, і думамі...») на словы Янкі Купалы *(гучыць запіс песні ў выкананні «Песняроў»)*.

Няхай гэтыя словы будуць для вас запаветам: «Любіце сваю зямлю, свой народ, сваю мову, сваю Радзіму».

**VI. Рэфлексія.**

Н а с т а ў н і к. Шаноўныя і дарагія вучні! Выстаўце, калі ласка, наперад свае далоні і ўявіце: на адну трэба пакласці веды, якія вы атрымалі на ўроку, а на другую — пачуцці, эмоцыі, якія перапаўнялі вас у час урока, а цяпер злучыце іх *(гучаць апладысменты)*.

Словы падзякі вучням, выстаўленне адзнак.